**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за жнівень 2021 г.**

**<u>Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу «Лето, книги, я - друзья»</u>**

**У жніўні ў публічных бібліятэках ДУК працягнуўся раённы конкурс летняга чытання «Лето, книги, я - друзья». У рамках конкурсу бібліятэкі праводзілі мерапрыемства для дзяцей і падлеткаў.**

**2 жніўня**

Падчас пазнавальна-забаўляльнай праграмы «Рознакаляровая гульня» дзеці пазнаёмілася з выставай «Кніжны дождж». Кроплі-смайлікі запрасілі хлопчыкаў і дзяўчынак да чытання, заставілі ўспомніць творы розных аўтараў. Юным карыстальнікам прапанавана знайсці адказы на загадкі пра аўтараў казак і літаратурных герояў, знайсці для дамашняга чытання кнігі і прачытаць урыўкі з іх. У канцы усе атрымалі салодкія прызы.

Стрыгаўская ПБ, 37 чал.

**8 жніўня**

У бібліятэцы прайшло чарговае пасяджэнне аматарскага клуба «Жывіца» ў форме эколага-пазнавальнага турніру «Тайники родной природы». Юныя ўдзельнікі даведаліся шмат новага і цікавага аб прыродных з’явах раслінна-жывельнага свету, прынялі ўдзел у конкурснай праграме, прагледзелі відэаагляд літаратуры.

Імянінская ПБ, 18 чал.

**11 жніўня**

Падчас правядзення чайных вячорак «Чай душистый, ароматный и на вкус всегда приятный» бібліятэкар пазнаёміла юных чытачоў з гісторыяй паходжання чаю, з легендамі пра чай, распавяла пра карысць чаявання, азнаёміла з правіламі захоўвання чаю. Дзяці прыгадалі казкі, у якіх галоўныя героі любяць чай, адказалі на пытанні віктарын «Кто больше знает названий чая», «Угадай, что за чай?», прынялі ўдзел у конкурсах «Реклама чая», «Веселые художники», адгадалі загадкі, паслухалі народныя прыказкі і прымаўкі пра чай. Скончылася мерапрыемства сяброўскім чаяваннем.

Гарадзецкі філіял, 27 чал.

**18 жніўня**

На выступленні лялечнага кружка «Петрушка» навучэнцы малодшых класаў, іх бацькі і бабулі прагледзелі казку «Как лиса волка судила» а таксама паўдзельнічалі ў віктарынах «Вспомни сказочных героев», «Смешной вопрос», «Приметы солнечного лета». Лепшыя чытачы і актыўныя ўдзельнікі ўзнагароджаны граматамі і салодкімі прызамі.

Лукская ПБ, 23 чал.

**22 жніўня**

Гадзіна летняга адпачынку «Чытаем, гуляем і адпачываем разам» праходзіла на свежым паветры. Дзяці гулялі ў інтэлектуальныя гульні, адгадвалі загадкі і прымалі актыўны ўдзел у выразным чытанні урыўкаў з твораў дзіцячай літаратуры. Пераможцы: Леўчук Аня, Нікуліна Сафія і Канцэвіч Арцём атрымалі салодкія пачастункі.

Хідрынская ПБ, 23 чал.

**22 жніўня**

У бібліятэцы адбыўся бібліязлёт юных карыстальнікаў «Лета, поўнае кніжных адкрыццяў». Дзецям давялося віртуальна пабываць у розных частках зямнога шара, адказаць на пытанні літаратурных віктарын і загадак: «Чый гэта партрэт?», «Паляна казак», «Назавіце загаловак казак», «Закончы прыказку пра кнігу. Напрыканцы мерапрыемства рабяты пазнаёміліся з кніжнай выставай «Кніга - лепшы сябар рабят».

Буховіцкая ПБ, 18 чал.

**25 жніўня**

Бібліятэкар сабрала сваіх юных карыстальнікаў на забаўляльна-прававую гульню «Права ребёнка в сказках». Дзеці адказалі на пытанні віктарыны «Права сказочных героев» і жартоўнай гульні «Какой я сказочный герой?». Прадстаўлена кніжная выстава «Права и преступления в сказках».

Батчынская ПБ, 15 чел.

## Іншыя мерапрыемствы

**5 жніўня**

Творчы вечар аўтара-выканаўцы з Масквы, гукарэжысёра Рускага духоўнага тэатра «Глас» Святланы Саннікавай-Залатаног сабраў сапраўдных паклоннікаў паэзіі і музыкі ў бібліятэцы. Госця падзялілася з гледачамі сваімі вершамі і песнямі, а яе сын Максім выканаў музычныя творы на гуслях. Прысутным прадстаўлены зборнік вершаў маскоўскага аўтара «Апрельская ночь», выдадзены ў Кобрыне.

*(Кобрынскі веснік. 2021. 18 жніўня; Кобрын-інформ.2021. № 31).*

*ЦРБ, 27 чал.*

**25 жніўня**

Члены літаратурнага клуба «ПоэтиКо» цэнтральнай раённай бібліятэкі прынялі ўдзел у канцэрце «Любить, молиться, петь», прымеркаваным да прастольнага свята Спаскага жаночага манастыра ў г. Кобрыне. Члены клуба Жанна Елізарава і Алена Котава падзяліліся з гледачамі сваімі вершамі на духоўную тэму. Фінальную песню выканала бібліятэкар цэнтральнай раённай бібліятэкі Наталля Раманюк.

*(Кобрынскі веснік. 2021. 25 жніўня; Кобрын-інформ.2021. № 33).*

**20 жніўня**

Пасяджэнне літаратурнага клуба «ПоэтиКо» прайшло ў фармаце размоўнага цюнінгу «Грани слова». Паэты падзяляліся сваёй творчасцю, у тым ліку зачытвалі дамашняе заданне (піражкі, парашкі, артышокі, хоку, танка, сэнрю), пазнаёміліся з паэтычнымі жанрамі і асаблівасцямі ўжывання словаў у залежнасці ад жанру твора.

ЦРБ, 12 чал.

**26 жніўня**

З мэтай папулярызацыі кніг духоўна-маральнага зместу бібліятэка правяла духоўна-асветніцкія чытанні «Нас роднит православие». Прысутныя абмяркоўвалі летнія праваслаўныя святы, дзяліліся ўражаннямі пра прачытаныя кнігі, зачытвалі лепшыя ўрыўкі з кніг. У рубрыцы «За советом к Батюшке» задаваліся пытанні ігумену Петрапаўлаўскай царквы – протаіерэю Аляксандру і клірыку гэтай царквы – протаіерэю Сергію. Чытанні суправаджаліся аднайменнай відэапрэзентацыяй, відэафільмамі, прэзентацыяй кутка духоўнага чытання.

Залеская ПБ, 27 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81